т4-04г.

Серыя
"У дапамогу педагогу"

# ПРАБЛЕМЫ ВЫХАВАННЯ

4/2004

обучение, развитие и воспитание законопослушных граждан, но не развлечение [1].

* * *

Сравнивая системы образования США и Беларуси, заметим, что американская система образования представляется более свободной, прозрачной и демократичной. Об этом свидетельствуют многие факты: дифференциация школ на общественные и частные, отсутствие общенационального учебного плана, деление предметов на обязательные и элективные, вариативность программ — образовательных и профессионально-технического обучения, специфика системы управления на местах. В американской системе образования понятия «внешкольное образование» или «внешкольное учреждение» найти крайне сложно. Это связано с тем, что она, во-первых, ставит перед собой другие цели в процессе социализации личности школьника, а во-вторых, образовательные программы в американских школах предлагают, как отмечалось выше, элективную систему предметов и богатый выбор дополнительных дисциплин.


1. *Бакмастер В.* Спорт для радости (о спортивной базе школ Америки) // Директор школы. — 2002. — № 4. — С. 38—41.
2. *Бутрим Г. А.* Пазашкольныя ўстановы ў сістэме сацыялізацыі // Пазашкольнае выхаванне. — 1998. — № 2. — С. 3—7.
3. *Кривов Ю. И.* Экология человеческого развития Ури Бронфенбренера // Педагогика. — 1998. — № 8.
4. *Edith M.* Freeman. School Social Work Practice NASW PRESS. — Washington, 1998. — P. 481.
5. Curriculum Handbook 2000—2001, Alexander County Public Schools.
6. Lisensure. Board of teaching. — St. Paul, MN. USA, 1990. — P. 23.





***В. С. Болбас, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, першы прарэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта,***

***І. С. Сычова, аспірантка***


# КАРАВАЙНЫ АБРАД ЯК ФОРМА МАРАЛЬНА-ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Традыцыйная культура харчавання беларусаў выпрацоўвалася стагоддзямі. Па назіраннях даследчыкаў, яна складалася з паўсядзённых і святочна-рытуальных абедаў або трапез. Апрача асноўных функцый яны ўтрымлівалі шэраг выхаваўча значных кампанентаў: афармленне страў, сервіроўка стала, правілы паводзін за ім і інш. Святочныя частаванні мелі ярка выражаную эстэтычную насычанасць, паколькі працэс ежы з'яўляўся важнай часткай народных свят, суправаджаўся песнямі, танцамі, рытуаламі. Гэта дазваляе разглядаць народную кухню не толькі як частку матэрыяльна-эстэтычнай культуры, але і як дзейсны, пераважна невербальны сродак маральна-эстэтычнага выхавання, а асноўныя абрады і святы — як формы арганізацыі вольнага часу і адначасова калектыўныя, комплексныя формы выхавання. Заўважым, што ў народнай педагогіцы кулінарныя веды і навыкі не фіксаваліся пісьмова, а перадаваліся вусна з пакалення ў пакаленне па жаночай лініі ад маці да дачкі, ад бабулі да ўнучкі, а таксама ў агульным рэчышчы спрадвечнага ладу жыцця і эстэтыкі побыту. Большасць старажытных беларускіх страў — каша, бліны, аладкі, хлеб, сыр, масла былі цесна звязаны з народнымі традыцыямі і прыкметамі, стваралі аснову не толькі паўсядзённага, але і святочнага стала. Так, на працягу стагоддзяў была выпрацавана арыгінальная культура прыгатавання ежы, што праявілася ў выбары прадуктаў, самабытных рэцэптах і назвах страў, якія захоўвалі цесную сувязь з роднай мовай, народнай эстэтыкай.

Пры гэтым святочныя частаванні, як і фальклор увогуле, падзяляліся на каляндарна-абрадавыя (талака, Дзяды) і сямейна-бытавыя (радзіны, вяселле). Першыя суправаджалі найбольш значныя падзеі гадавога колазвароту, а другія — падзеі ў жыцці кожнага чалавека, сям'і. Практычна любое народнае свята, абрад, традыцыя мелі сваю эстэтычную адметнасць, вызначаліся характэрнымі абрадавымі стравамі. Радзіны славутыя бабінай кашай, Каляды — куццёй, Масленіца — блінамі і інш. Упрыгожаннем і галоўнай аздобай святочнага вясельнага стала быў каравай — вяршыня кулінарнага майстэрства вясковых жанчын, сапраўдны ўзор народнага мастацтва, увасоблены ў матэрыяльную форму. У дадзеным кантэксце каравай — вясельнае абрадавае печыва, прыгатаванае па спецыяльным рэцэпце — абрадавы хлеб. Часцей за ўсё былі два святочныя каравαі: адзін — з боку маладой, другі — з боку маладога, а таксама непасрэдна каравайны абрад («сукупнасць традыцыйных умоўных дзеянняў, што сімвалічна выражаюць і замацоўваюць адносіны людзей да прыроды і паміж сабою, іх паводзіны ў важных жыццёвых сітуацыях, якія сістэматычна паўтараюцца» [5, с. 14]) як састаўная частка эстэтычна-мастацкай структуры вяселля. Пры гэтым, уваходзячы ў комплексную вясельную ўрачыстасць, абрад выпечкі і дзяльбы каравая складаў цэлы раздзел народнай культуры, меў дэталёва распрацаваны сцэнарый з песнямі, гульнямі і рытуаламі, у якім беларускія фалькларысты выдзяляюць да 15 паслядоўна разгортваемых структурных элементаў [2, с. 197], і, па сутнасці, уяўляў сабой самастойную форму маральна-эстэтычнага выхавання.

Разглядаючы выхаваўчую сутнасць народнага каравайнага абраду, трэба мець на ўвазе глыбокую пашану народа да хлеба, што трывала ўвайшла ў свядомасць, прыказкі і прымаўкі, услаўлялася ў песнях і казках. Хлеб з'яўляўся часткай не толькі матэрыяльнага, але і духоўнага жыцця народа, складаў аснову народнага этыкету. Даследчыкі адзначаюць, што ў агульнакультурным кантэксце без яго і рытуальнай ежы ўвогуле не абыходзіліся асноўныя этапы жыцця чалавека. «Хлеб як атрыбут абрадавага дзеяння сімвалізаваў пераход з аднаго фізічнага і сацыяльнага статуса ў іншы. Спечаны хлеб падкрэсліваў закончанасць (смерць) адной фазы, а зерне (тое, што доўжыць жыццё, дае яму новы імпульс, чарговы, больш высокі ўзровень на бясконцай спіралі касмічнага існавання) канстатавала пачатак (нараджэнне) другой» [2, с. 197]. І калі павага да хлеба — аснова народнага выхавання, то каравайны абрад у многім выяўляе яго глыбінныя, нават сакральныя асновы. Невыпадкова пры дзяльбе каравая ўсе прысутныя на вяселлі імкнуліся атрымаць кавалак рытуальнага хлеба, бо яго ўжыванне, па народных перакананнях, садзейнічала ў будучым багатаму ўраджаю, забяспечвала дастатак і шчасце: «Дзелячы каравай, старшы сват (стараста) сярэдзіну аддаваў маладым, «падэшву» (ніз каравая) — музыкам, астатнюю частку дзяліў паміж роднымі ў залежнасці ад ступені сваяцтва» [5, с. 247]. Пры гэтым для дзяцей рыхтавалася спецыяльнае печыва, часта ў форме маленькіх каравайчыкаў або гусачак, шышачак і інш. Для музыкантаў у некаторых мясцовасцях пяклі булку ў выглядзе скрыпкі і пры гэтым казалі, што «пякуць музыку».

Гэтыя фігуркі мелі і іншае прызначэнне, цесна звязанае з міфалагічнымі ўяўленнямі, з культам продкаў, які з'яўляўся асновай маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, яе падмуркам: «З рэшткі цеста каравайніцы выраблялі другасныя каравαі, іх называлі каравайчыкі, падручнікі, шышкі, гускі, баранкі, ясачкі, драмушкі, ялавіцы, пастушкі, пеўнікі, музыкі і інш. і выкарыстоўвалі з пэўнымі мэтамі ў розныя моманты вяселля. Ахоўную ролю выконвалі падручнік, шышка, месяц, якія на працягу ўсяго вяселля маладыя трымалі ў руках, за пазухай; падзяку духам продкаў, дамавіку і сямейным духам азначалі пакладзеныя на кут, парог, прыпечак, паліцу каравайчыкі і г. д.» [5, с. 246]. Даследчыкі выказваюць меркаванне, што раней каравай выконваў функцыі матэрыялізаванага бога-продка. Відаць, з гэтай нагоды галоўны (старшы) каравай з'яўляўся абавяз-

ковым элементам асноўных момантаў вяселля: «Яго ўносілі ў хату, калі зводзілі маладых і іх роды, ставілі ў клеці ў першую шлюбную ноч, на яго клалі завіванне нявесты, яе пояс і падвянечную кашулю маладога, падараваныя ім рэчы, грошы і г. д.» [5, с. 246]. Існаваў звычай дзяліць родавы каравай паміж прадстаўнікамі мена-віта свайго роду, і маладыя, такім чынам, знаходзіліся пад аховай жывых і памерлых сваякоў: «Да збірайся, род, к роду / Да старыя бабкі на параду, / Маладыя малодачкі к караваю» [2, с. 203].

На фарміраванне асобы істотнае выхаваўчае ўздзеянне аказвала грамадская думка, што відаць і на прыкладзе прыгатавання каравая, падборы ўдзельнікаў для гэтага важнага рытуалу, дзе прысутнічалі лепшыя прадстаўнікі сельскай абшчыны. Вясельны каравай выпякалі спецыяльна запрошаныя жанчыны-каравайніцы, ад якіх патрабавалася не толькі кулінарнае майстэрства і добры густ, але і высокія маральныя якасці, звярталася ўвага, каб яны жылі ў сямейнай згодзе і абавязкова мелі дзяцей. У прыгатаванні каравая ўдзельнічалі не толькі жанчыны, але і мужчыны: «Спяваць у час пячэння каравая і яго ўпрыгожвання запрашалі маладых дзяўчат, рыхтаваць дровы, печ і неабходныя прылады для прыгатавання абрадавага хлеба — жанатых мужчын, саджаць каравай у печ — нежанатага хлопца, пажадана кучаравага. Запрашалі і суседзяў, бо лічылася, што чым больш людзей, гоману і весялосці, тым лепш удасца каравай, а значыць, будучае жыццё маладых» [5, с. 246]. Большасць песень і дзеянняў падкрэслівалі адзінства сям'і і пэўнага роду, былі прасякнуты ідэямі ўзаемадапамогі, клопату аб маладой сям'і. Даследчыкі адзначаюць, што на прыкладзе каравая прасочваецца талочнасць, сабornасць беларускай культуры. Запрошаныя на вяселле сваякі і суседзі неслі муку, яйкі, масла, упрыгажэнні для каравая, укладаючы ў гэта значны выхаваўчы сэнс, дэманстравалі роднасць, калектывізм.

Суправаджаючыся шэрагам прыгожых паэтычна-магічных дзеянняў, каравайны абрад сімвалізаваў маральна-духоўныя асновы маладой сям'і: «Рошчыну размешвала правай рукой у адзін бок па ходзе сонца старшая каравайніца — звычайна хросная маці — або па чарзе ўсе каравайніцы. Каравай мясілі далонямі, а не кулакамі, каб маладыя ніколі не падымаў рукі на маладую, рабілі яго густым, салодкім, прыгожым, часам без солі, дабаўляючы невялікую колькасць гарэлкі, што азначала багацце і весялосць будучай пары. Каб надзяліць увесь род караваем, яго рабілі вялікім» [2, с. 246]. Згодна са звычаем сват з кожнага боку (маладой і маладога) імкнуўся падняць свой каравай вышэй, што азначала перавагу аднаго з членаў будучай сям'і і адпаведна аднаго з родаў і закладвала праграму паводзін будучага сямейнага жыцця. Метафарычная прыгажосць і просьбы аб шчаслівай долі маладых суправаджаюць увесь абрад. Каб каравай удаўся пышны і чырвоны (прыгожы, румяны), печ палілі дубовымі ці бярозавымі дровамі, яго клалі на вышыты ручнік, упрыгожвалі і спявалі: «Караваю, мой раю, / Я табе пяю, іграю. / Красівыя мясілі, / Шчаслівыя садзілі» [2, с. 202]. Гэта паказвае, што музыка, спевы, увогуле народнае мастацтва лічылася сродкам магічнага і выхаваўчага ўздзеяння.

Традыцыйнай народнай культуры ўвогуле ўласцівы сінкрэтызм, дзе практычна няма межаў паміж непасрэдна святам і выхаваўчым працэсам, паміж мараллю, эстэтыкай і міфалогіяй. І каравайны абрад адлюстроўвае глыбокі сімвалізм народнай культуры, магічнае і сімвалічнаметафарычнае ўспрыняцце навакольнай рэчаіснасці: «Дровы бралі з трох двароў і з трох розных парод дрэў, якія лічацца ў гэтай мясцовасці «шчаслівымі», ваду — з трох крыніц, масла ад кароў першага ацёлу, мёд — ярых пчол, муку — з сырога зерня або сушанага не ў печы. Памяло, лапата, дзяжа, вілкі і інш. прылады павінны былі быць новымі. Дзяжу ставілі пасярод хаты на вывернутым кажусе, сыпалі ў яе муку і лілі ваду за адзін прыём» [5, с. 246].

Магічнае, а таксама пэўнае выхаваўчае значэнне мелі ўсе рэчы і прадукты, звязаныя з караваем і яго прыгатаваннем, аб чым сведчыць апісанне абраду: «Лапатай,

якой пасадзілі каравай, тройчы стукалі ў паднябенне печы або ў столь хаты, калі ў гаспадара былі незамужнія дочкі, дакраналіся да іх галоў, а затым выносілі лапату на двор і кідалі яе цераз хату, каб яна зламалася. Рэшткамі цеста на руках каравайніцы мазалі твары прысутным мужчынам, потым мылі рукі, а ваду вылівалі пад вішні, яблыні, на ток, у хлеў, «каб усё радзіла і пладзіла». Старшая каравайніца са сватам насілі па хаце дзяжу, тройчы кружыліся з ёю, цалаваліся, дзяўчаты імкнуліся як мага хутчэй выкаціць дзяжу на вуліцу, каб выйсці замуж, а хлопцы перашкаджалі ім. Дастаўшы каравай з печы і тройчы з ім пакружыўшыся, клалі яго на века дзяжы, накрытае белым абрусам і пасыпанае аўсом, жытам і хмелем» [5, с. 246]. Такім чынам, абрад суправаджаўся шэрагам эстэтычна-магічных дзеянняў, якія і сёння дазваляюць спасцігнуць гуманізм народнай культуры і выхавання. Глыбінныя асновы гэтай з'явы страчаны і для сучаснага чалавека нясуць пераважна маральна-эстэтычную значымасць, але яны маюць глыбокія карані і звязаны з асноўнымі прынцыпамі міфалагічнай свядомасці, якія актыўна распрацоўваюцца большасцю сучасных даследчыкаў міфалогіі і народнай культуры. Менавіта імі тлумачыцца выкарыстанне магіі пачатку і падабенства ў ходзе народных святаў і абрадаў, шырокае ўжыванне замоў, прыкмет і павер'яў з мэтай уплываць на рэальныя з'явы і падзеі, скіраваць іх у іншае, жаданае, рэчышча. Можна лічыць, што гэта з'ява аказала значны ўплыў не толькі на маральныя і эстэтычныя нормы, спосабы паводзін у традыцыйным грамадстве, але і непасрэдна на працэс выхавання.

Асобны раздзел складае эстэтыка каравая, які выпякаўся з высакаякасных прадуктаў, аздабляўся сімвалічнымі фігуркамі з цеста, рутай, мятай, калінай, дзе ва ўсёй паўнаце праявіліся багатая сімволіка, фантазія, творчасць. У каравайных песнях выкарыстаны яркія вобразы фальклору: удзельнікі абраду параўноўваліся з нябеснымі свяцiламі, карагодам зор і інш. Нярэдка вясельны каравай упрыгожваўся выявамі сонца, месяца, зорак, якія



лічыліся эстэтычна значнымі прыроднымі аб'ектамі, або нават выпякаўся ў адпаведнай форме, прычым маладую сімвалізавала сонца, а маладога — месяц. Падобная сімволіка характэрна для большасці беларускіх народных песень, казак, загадак. «Каравай меў форму круглай булкі, якую ў маладой апаясвалі абручом, сплеценым з цеста ў выглядзе касы, што сімвалізавала яе дзявоцкасць, а ў маладога на каравай клалі просты абручык. Часам каравай у маладога рабілі ў выглядзе паўмесяца» [5, с. 246]. Такім чынам, форму каравая можна лічыць вобразам-сімвалам, дзякуючы якому госці маглі атрымаць звесткі аб маральнай чысціні і фізічнай моцы маладых. Адным з найважнейшых вясельных абрадаў быў пасад маладой на дзяжу (у многіх мясцовасцях адзначаецца і пасад маладога), абавязковай умовай якога з'яўлялася захаванне цнатлівасці. Ва ўсіх выпадках фалькларыстамі падкрэсліваецца прысутнасць каравая, яго важная роля пры пасадзе і атрыманні бацькоўскага благаславення [4, с. 160].

Сімволіка каравая звязана з агульнаславянскай і нават сусветнай міфалогіяй, якая ўтрымлівае значны выхаваўчы патэнцыял, мовай міфалагічных вобразаў, адлюстроўвае маральныя нормы і эстэтычныя прыярытэты продкаў. Даследчыкі славянскай міфалогіі даказалі, што каравай выконваў магічныя функцыі, сярод якіх адзначаюцца найважнейшыя: з'яўляўся сімвалам жаніха і нявесты, шчаслівага жыцця і дзетанараджэння; сімвалам нябесных мужа і жонкі (Сонца і Месяца); сімвалам продкаў і ўраджаю. У мінулым, магчыма, выкарыстоўваўся як ахвярапрынашэнне багам, замяніўшы сабою карову ці іншых жывёл [4, с. 202]. Каравай лічыўся адушаўлёнай міфалагічнай істотай, якая ў песнях уступала ў дыялог з каравайніцамі, печчу, распытвала і знаходзіла дарогу ў клецьда маладых. Адзначым таксама, што і ў народным ткацтве вядомы вобразы сонца, месяца, хлеба, язычніцкай міфалогіі, звязаныя з урадлівасцю і ўраджаем, якія можна параўнаць з багатай і разнастайнай сімволікай каравая, што дапаможа моладзі глыбей зразумець народную культуру [1, с. 116, 207].

Вобраз сонца



Вобраз хлеба



Эстэтычным сімвалам беларускага першадрукара XVI стагоддзя Францыска Скарыны таксама з'яўляўся сігнет з выявай сонца і месяца, які мае глыбока народныя карані ў фальклоры. Такім чынам, народная сімволіка магла быць пераасэнсавана Ф. Скарынам у духу патрабаванняў сваёй эпохі і асветніцкай дзейнасці.

Дастаўшы каравай з печы і здзейсніўшы неабходны рытуал, каравайніцы пачыналі яго аздабляць. У беларускай традыцыі вядомы два віды яго ўпрыгожвання: фігуркамі, спечанымі з цеста, і галінкамі. Караваі жаніха і нявесты афармляліся па-рознаму, што важна ў працэсе стварэння маладой сям'і, асэнсавання кожным сваёй ролі ў шлюбе. Вопытныя гаспадыні перадавалі моладзі лепшыя традыцыі народнай кулінарыі. Пазней вынік працы і сумеснай творчасці дэманстраваўся грамадзе, якая ў час вяселля ацэньвала навыкі каравайніц, іх уменне строга прытрымлівацца традыцыі, а таксама праяўляць у межах правіл уласную вынаходлівасць, пачуццё меры і эстэтычны густ.

У першым выпадку, калі каравай аздабляўся фігуркамі з цеста, «на каравай маладой пасярэдзіне ставілі спечаную з цеста вялікую шышку або гуску, а вакол — маленькія шышачкі, гусачкі, зорачкі, кветачкі, васьмёркі, фігурку спавітага дзіцяці і інш., а пасярэдзіне каравая маладога — часцей за ўсё паўмесяц, часам — шышку або гусачка, вакол — бочачкі з абручыкамі, пеўня, курыцу і інш. Зверху каравай упрыгожвалі зелянінай (лісцікамі, пучочкамі руты, мірта, мяты, каліны), ягадамі брусніц, вішні, рабіны, кветкамі з каляровай паперы»



[5, с. 246]. Спосаб аздаблення вясельнага каравая галінкамі апісваецца наступным чынам: «У ім фігуркі з цеста — не асноўнае аздабленне, іх і не відаць з-за галінак елкі, сасны, грушы, яблыні, упрыгожаных зверху фарбаванымі пучкамі аўса, рабіны, каліны, зялёнай амялы з белымі ягадкамі. На Палессі гэтыя ўпрыгожаныя рагацінкі называлі шышкамі. Каб шышкі з рагацінак не нахіляліся ў бакі, іх абвязвалі чырвоным поясам з нанізанымі на яго абаранкамі, а зверху пакрывалі каляровай або белай хусткай, сам каравай абвязвалі вышытым ручніком. Зверху да шышак часта прывязвалі адну або тры свечкі, якія запальвалі ў кульмінацыйныя моманты вяселля» [5, с. 247]. Пры гэтым вясельны каравай сімвалізаваў шчасце і долю маладых і не выкарыстоўваўся пры паўторным шлюбе, што падкрэслівае яго выключна важнае значэнне ў працэсе стварэння сям'і, а рытуальнай ежы — у народнай эстэтыцы і выхаванні.

Афармленне вясельнага стала патрабавала агульнай гармоніі ўсіх скаладальнікаў — посуду, абрусаў, адзення, твораў вуснай народнай творчасці і г. д. Да гэтага адзінства дапасоўваліся і традыцыйныя стравы, якія падаваліся на стол і сімвалізавалі працяг роду, дабрабыт і здароўе будучай сям'і. Каравайны абрад нарадзіў каравайныя песні, замовы, шматлікія прымаўленні, рыфмаваныя пажаданні маладым, прасякнутыя элементамі народнага гумару і досціпу. Харавыя спевы, якія суправаджалі абрад дзяльбы каравая, самі па сабе з'яўляліся значным мастацкім відовішчам і аказвалі глыбокае эмацыянальнае ўздзеянне на прысутных.

Такім чынам, у працэсе каравайнага абраду выкарыстоўваліся ўсе даступныя сродкі народнай культуры і выхавання: мова, жэст, міміка, пантаміміка, танец, музыка, каляровая гама і інш., — што павялічвала яго выхаваўчае ўздзеянне.

Важнымі асаблівасцямі традыцыйных форм выхавання былі іх паўтаральнасць, устойлівасць, цыклічнасць, сістэматычнасць ужывання. Гэта стварала пэўны рытм культурнага жыцця і аблягчала працэс засваення эстэтычнай

культуры. Пры гэтым можна заўважыць, што выхаваўчы працэс у народнай педагогіцы працягваўся, па сутнасці, усё жыццё. Але ў кожным узросце і на кожным жыццёвым этапе канкрэтная святочная дзея ўспрымалася і ацэньвалася па-рознаму. Як сведчыць апісанне каравайнага абраду, разам з дарослымі ў ім удзельнічалі і дзеці, што садзейнічала іх паступоваму далучэнню да народнай культуры, засваенню мастацкай мовы і маральна-эстэтычных каштоўнасцей свайго народа. Напрыклад, дзесяць хлопчыкаў, якіх называлі «запарозцамі», імітавалі галасы падараваных маладым жывёл: гусей, курэй, авечак, кароў, а таксама звон грошай, завучвалі і гаварылі жартоўныя формулы-пажаданні [4, с. 199]. Пры гэтым у ходзе тэатралізаванай гульні пераважала не лагічна-інтэлектуальнае, а пачуццёва-эмацыянальнае, рэалізаванае непасрэдна ў дзеянні спасціжэнне этнічнага паняцця прыгажосці і ўмоўнай мовы рытуалу.

Адносна добрая захаванасць і даследаванасць каравайнай абраднасці ў культуры славянскіх народаў дазваляе выкарыстоўваць багаты фальклорны матэрыял у сучасным працэсе маральна-эстэтычнага выхавання моладзі, а мастацкае багацце каравайнага абраду, яго сімвалізм — паказаць народную культуру ў цэласным адзінстве. На прыкладзе каравайнай абраднасці ў выхаваўчых мэтах могуць быць арганізаваны і карагодныя гульні для малодшых школьнікаў, і больш разгорнутыя мерапрыемствы для юнакоў і дзяўчат, якія пазнаёмяць уступаючых у жыццё з традыцыямі і народнай эстэтыкай у афармленні святочнага стала, са значнасцю маральных запаветаў продкаў у стварэнні маладой сям'і. І сучаснае вяселле, як правіла, не абыходзіцца без каравая, хаця ён часцей замяняецца пакупным тортам або іншым печывам. У дадзеным выпадку парушаецца цэласнасць абраду, а набытыя ў краме заменнікі абрадавага хлеба не заўсёды адпавядаюць агульнаму эмацыянальнаму настрою калектыўнага прыгатавання, патрабаванням да вясельнага каравая народнай маралі, якія сфакусіраваны ў формуле «Вакол з сырам, з маслам, а ўсярэдзіне з добрым шчасцем» [3, с. 131]. Сёння відавочна, што



азначаны працэс не можа быць узноўлены толькі ў ходзе сямейнага выхавання. У сувязі з гэтым варта нагадаць, што ў Японіі адным з масавых напрамкаў эстэтычнага выхавання з'яўляецца нацыянальная кулінарыя. Існуюць прыватныя студыі, дзе вучаць не толькі маляванню, ігры на музычных інструментах, але і перадаюць дзяўчатам традыцыі японскай кухні, знаёмяць з асноўнымі правіламі ў гэтай важнай, надзённай і патрэбнай галіне чалавечай жыццядзейнасці. Увага надаецца афармленню страў, правілам этыкету і рытуалам, што развівае эстэтычны густ, дазваляе падтрымліваць сувязь пакаленняў [3, с. 180]. Захаванне традыцый нацыянальнай кухні кожнага са славянскіх народаў (у аснове якіх знаходзіцца моцнае агульнаславянскае ядро) таксама можа стаць не менш цікавым, запатрабаваным і дзейсным напрамкам маральна-эстэтычнага выхавання.

1. *Кацар М. С.* Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / Навук. рэд. Я. М. Сахута. — Мн.: БелЭн, 1996. — 208 с.

2. *Крук Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры. — 2-е выд., стэр. — Мн.: Ураджай, 2000. — 448 с.

3. Современные концепции эстетического воспитания (теория и практика). — М.: ИФРАН, 1998. — 300 с.

4. Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік, А. С. Емяльянаў, У. М. Сысоў, М. А. Каладзінскі; Навук. рэд. К. П. Кабашнікаў. — Мн.: Бел. навука, 2001. — 422 с.

5. Этнаграфія Беларусі. — Мн.: БелСЭ, 1989. — 575 с.

*Лучше держать детей в строгости и в страхе, чем открывать им глубину своей любви и тем самым открывать им дверь к своеволию и непослушанию.*

**Я. А. Коменский**

*Наказания должны быть производимы всегда с осторожностью, так чтобы дети видели, что конечной целью наказаний служит только их исправление.*

**И. Кант**